Аддзел адукацыі, спорта і
Адміністрацыі Маскоўскага раёна г.Брэста
Дзяржаўная ўстанова адукацыі “ Сярэдняя школа №7 г.Брэста

# ТЭМА: “ ІМЁНЫ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ У НАЗВАХ ВУЛІЦ МАСКОЎСКАГА РАЁНА Г.БРЭСТА ”

Марчык Ганна - Марыя VIII “А” клас
Трыбуховіч Таісія VIII “А” клас
Кіраўнік С.В.Салей
настаўнік беларускай мовы

г.Брэст,
Вул.Горкага, 20

2017г.

Рэцэнзія на даследчую работу " ІМЁНЫ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ У НАЗВАХ ВУЛІЦ МАСКОЎСКАГА РАЁНА Г.БРЭСТА "

Даследчая работа па тэме " ІМЁНЫ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ У НАЗВАХ ВУЛІЦ МАСКОЎСКАГА РАЁНА Г.БРЭСТА ", якую выканалі вучні VIII "А" класа Марчык Ганна-Марыя і Трыбуховіч Таісія скіравана на абуджэне ў моладзі цікавасці да свёй малой радзімы, выхаванне паважлівых адносін да гісторыі, беларускай літаратуры, выхаванне пачуцця патрыятызму, нацыянальнай годнасці. Асабліва актуальнай абраная тэма з'яўляецца напярэдадні святкавання 1000-гадовага юбілею г.Брэста.

Даследчая работа мае дакладную структуру і складаецца з уводзін, асноўнай часткі, заканчэння, спісу літаратуры і дадаткаў. Афармленне работы ў цэлым адпавядае прапанаваным патрабаванням.

Ва ўводзінах Марчык Г-М. і Трыбуховіч Т. растлумачылі актуальнасць работы і праанлізавалі ўжыванне імён беларускіх пісьменнікаў у назвах вуліц Маскоўскага раёна г.Брэста. Акрэслілі мэты і паставілі канкрэтныя задачы. У выніку дакладнай фармуліроўкі мэт у асноўнай частцы даследчай работы прысутнічаюць лагічнасць, дакладнасць, паслядоўнасць. Наяўнасць дадаткаў паказвае на дэтальную работу з дакументамі, літаратурай і рэсурсамі Інтэрнэт. У рабоце Марчык Г-М. і Трыбуховіч Т. правялі даследаванне па выяўленні колькасці вуліц Маскоўскага раёна г.Брэста, вуліц, названых у гонар славутых людзей, у гонар беларускіх пісьменнікаў. Прааналізавалі вынікі даследаванняў, склалі дыяграмы і сцісла сфармулявлі асноўныя вывады.

Спіс літаратуры уключае разнастайныя крыніцы як беларускамоўныя, так і на рускай мове. Спіс аформлены ў адпаведнасці з паптрабаваннямі.

У цэлым работа заслугоўвае выдатнай адзнакі.

Рэкамендацыі: працягваць работу па даследванню з мэтай пашырэння доказнай базы для сваіх вывадаў.

Намеснік дырэктара па выхаваучай рабоце Т.У.Болычава

**Уводзіны**

Напярэдадні святкавання 1000-гадовага юбілею г.Брэста пашыраецца цікавасць да нашага старажытнага горада як з боку замежных падарожнікаў, так і з боку нашых землякоў. Многім гістарычным падзеям быў сведкам наш старажытны горад, яны знайшлі адбітак у назвах вуліц. Назвам вуліц роднага Брэста, а ў прыватнасці – вуліц Маскоўскага раёна, якія носяць імёны беларускіх пісьменнікаў і паэтаў ад старажытнасці да нашых дзён прысвечана наша даследаванне.

Такім чынам *аб’ектам даследавання* становяцца вуліцы Маскоўскага раёна, а *прадмет даследавання* - імёны беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, якія ўнеслі вялікі ўклад у сусветную літартурную спадчыну.

**Мэты:**

- выклікаць цікавасць да мінулага і сучаснасці свёй малой радзімы;
- спрыяць пашырэнню ведаў вучняў пра гісторыю сваёй малой радзімы, знакамітых берасцейцаў;
- выпрацоўваць навыкі маналогічнага выступлення;
- развіваць імкненне да пошукавай і даследчай дзейнасці, творчыя здольнасці вучняў;
- выхоўваць паважлівыя адгосіны да гісторыі, беражлівае стаўленне да чалавека, пачуццё патрыятызму, нацыянальнай і ўласнай годнасці.

**Задачы:**

- даць уяўленне аб славутых земляках-сучасніках і продках;
- развіваць у вучняў уменне асэнсоўваць, вызначаць адметнае;
- выхоўваць беражлівае стаўленне да спадчыны.

Глава 1

*Суаднясенне імёнаў беларускіх пісьменнікаў адносна назваў вуліц Маскоўскага раёна*

Г. Брэст падзелены ў 1978г. падзелены на два раёны: Ленінскі і Маскоўскі. Дадатак 1

Маскоўскі раён налічвае 342 вуліцы з іх 11 носяць імёны беларускіх пісьменнікаў і паэтаў. З ніжэй прапанаванай табліцы відаць, якую долю гэта складае ад агульнай клоькасці вуліц і тых вуліц, якія названы ў гонар заслужаных людзей.

Сярод гэтых назваў імёны тых, хто змагаўся за праваслаўную веру, як асветнік, святы абаронца г. Брэста Св. Афанасій Брэсцкі, тых, хто адстойваў нацыянальную годнасць беларусаў, як нястомны барацьбіт Тадэуш Касцюшка, тых, хто апяваў прыгажосць роднай зямлі і працаздольнасць людзей, як паэт Адам Міцкевіч і мастак Напалеон Орда, тых, хто абараняў нашу Радзіму ад фашысцкай навалы, як І. Пранягін, тых, хто клапаціўся пра росквіт нашай дзяржавы ў мірны час, як П.М. Машэраў і многія іншыя творцы гісторыі.
Асобы раздзел складаюць вуліцы, названыя ў гонар беларускіх пісьменнікаў. Дадатак 3 (Спіс назваў элементаў вулічна-дарожнай сяці г. Брэста, якім прысвоены імёны беларускіх пісьменнікаў)

Глава 2

***Характарыстыка вуліц***

*Вуліца Калесніка* размешчана ў паўднёва-заходнім мікрараёне-4.




Пачала забудоўвацца ў 1990-х гадах. Названая ў гонар беларускага літаратуразнаўцы, празаіка, вучонага Уладзіміра Калесніка. Працягласць 785 метраў. Галоўнай славутасцю вуліцы Калесніка, забудаванай камфортнымі шматпавярховымі жылымі дамамі, з'яўляецца сярэдняя школа N 1, адкрытая 1 верасня 2014 года**.** Арыгінальны праект лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Валерыя Кескевіч не мае аналагаў у краіне. Будынак мае розную вышыню - 2, 3 і 4 паверхі і выглядае звонку як сапраўдны палац (генеральным падрадчыкам будаўніцтва выступіла ААТ Будтрэст N 8). У самой школе, акрамя "стандартных" класаў, ёсць 3 спартыўныя залы з трыбунамі, два ціра ў падвальных памяшканнях, трэнажорная, харэаграфічная і актавая залы, аранжарэя. Старанна прадумана безбар'ернае асяроддзе для вучняў з абмежаванымі магчымасцямі - збудаваныя пандусы пры ўваходах, усярэдзіне маецца ліфт. Насупраць школы размяшчаецца дзіцячы садок N 73, таксама адрозны арыгінальнай архітэктурай і кампактным размяшчэннем пляцовак для гульняў.

*Вуліца Міцкевіча* знаходзіцца ў цэнтры горада.



Працягласць каля 1300 м – ад вуліцы Леніна да вуліцы Мянжынскага. Яна пачала забудоўвацца ў 1830-я гады. Раней вуліца Міцкевіча насіла назвы

Кірпічная і Дваранская, з 1921 да 1941 г – імя Міцкевіча, пры гітлераўскім акупацыйным рэжыме – Балверкаллее. У 1944 годзе вуліцы вярнулі даваенную назву. Адна з важнейшых транспартных магістраляў цэнтра сучаснага горада. На вуліцы Міцкевіча захаваліся два будынкі – помнікі архітэктуры XIX стагоддзя з рысамі класіцызму.



Гэтым будынкам уласцівы лаканізм, у рашэнні планаў і фасадаў. Яны пабудаваны з цэглы з выкарыстаннем драўляных дэталяў. Цэнтр будынка двухпавярховы, бакавыя будынкі аднапавярховыя. Сярэдняя частка галоўнага фасада выдзелена чатырохкалонным порцікам. На ўзроўні другога паверха па ўсёй шырыні порціка – балкон з драўлянай балюстрадай. Да будынка з тарцоў прыбудаваны лесвічныя ўваходы. Маёнтак дэкарыраваны карнізамі, сандрыкамі над вокнамі. Будынак мае цокальны паверх.

Да архітэктурных помнікаў пачатку XX ст. адносіцца і будынак былой мужчынскай гімназіі. Пабудавана ў 1903 г. У «цагляным» стылі, будынак займаў цэлы квартал. Па хадатайству гарадской Рады, 25 верасня 1904 г. было дазволена новае названне навучальнай установы « Яго Імператарскай Вялікасці Цэсарэаіча Аляксея Мікалаевіча поўная мужчынская гімназія». З 3 сакавіка 1921 у будынку мужчынскай гімназіі размяшчалася самая прэстыжная сярэдняя навучальная ўстанова палескага краю – дзяржаўная гімназія імя Рамуальда Траўгутта. Цяпер гэта адзін з вучэбных карпусоў Дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С.Пушкіна.



*Набярэжная Францыска Скарыны* размешчана ў паўднёва-ўсходняй частцы горада (былая вёска Шпановічы). працягласць 500 м - па правым беразе ракі Мухавец ад бульвара Шаўчэнкі да вуліцы Чырванасцяжнай.

Ранейшыя назвы - Надрэчная, Надбжэжна, Набярэжная. Канчаткова сфармавалася ў 1960-1970-я гады. Набярэжная забудавана 5 і 9-павярховымі жылымі дамамі з убудаванымі прадпрыемствамі гандлю. На ўчастку ад бульвара Шаўчэнкі да Чырванасцяжнай узведзены ансамбль жылых дамоў. На вуліцы размешчаны Дом грамадзянскіх абрадаў, дзіцячая гарадская бібліятэка,

гандлёвыя прадпрыемствы. Паўднёвы бок займаюць пляж, плаўбаза «Клуба юных маракоў». Уздоўж вуліцы высаджана алея пірамідальных тапаляў.

Вуліца *Янкі Купалы* размешчана ва ўсходняй частцы горада.



Імем Янкі Купалы названа ў 1972 годзе (ранейшая назва - Завадская). Працягласць парадку 4000 м - ад вуліцы Піянерскай да тралейбуснага кальца. Забудоўвалася з 50-х гадах XX стагоддзя, асабліва інтэнсіўна з 2-й паловы 60-х гадоў, калі пачалося фарміраванне ўсходняга прамысловага вузла і жылога раёна ”Усход”. Сучаснае аблічча вуліцы склалася ў 70-х гадах XX стагоддзя. Да перасячэння з Партызанскім праспектам на левым яе баку вытворчыя будынкі чаргуюцца з 5-павярховымі, пераважна панэльнымі, жылымі дамамі з убудаванымі магазінамі. Вылучаюцца дзяржаўныя прафесійны ліцэй лёгкай прамысловасці і прафесійна-тэхнічны каледж прыборабудавання. У глыбіні жылога масіва знаходзяцца сярэдняя школа N 22, Брэсцкі дзяржаўны інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі, Брэсцкі абласны сацыяльна -педагагічны цэнтр. На правым баку вуліцы размешчаны ААТ "Дываны Брэста", ААТ "Брэсцкі панчошны камбінат", фабрыка сувеніраў «Славянка», прадпрыемствы гандлю, бытавога і тэхнічнага абслугоўвання. Участак вуліцы, які прымыкае да скрыжавання з партызанскім праспектам, забудаваны рознапавярховымі будынкамі. Тут размешчаны УМП "Компа", МПУ "Брэстміжрайгаз", вытворча-тэхнічны цэнтр Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС рэспублікі, аўтазаправачная станцыя і мыйка машын, інтэрната ААТ "Дываны Брэста" і ААТ "Савушкін прадукт", 9-павярховыя жылыя дамы. На ўсходнім участку вуліцы Янкі Купалы знаходзяцца адміністрацыйныя і вытворчыя будынкі ААТ "Савушкін прадукт", ПГУП "Брэсцкая база "Аблкаапгасгандлю"адкрытыя акцыянерныя таварыствы "Культбытгасгандаль" і "Брэстабутакгандаль", Брэсцкая абласная база "Бакалея", тралейбусны парк.

Вышэй пералічаныя вуліцы ( вул. Калесніка, Міцкевіча, Янкі Купалы, наб. Францыска Скарыны ) з’яўляюцца градавызначальнымі магістралямі. Але з 11 вуліц Маскоўскага раёна г.Брэста, якія названы ў гонар беларускіх пісьменнікаў, 7 вуліц знаходзяцца ў прыватным сектары. Гэта вуліцы Свята-Афанасьеўская, Мележа, Якуба Коласа, Нямцэвіча, Напалеона Орды, Філатава.

Вуліца *Мележа*



Вуліца размешчана ў мікрараёне Аркадзя, даўжыня - 1015 м. Складаецца з трох частак.

Вуліца *Свята-Афанасьеўская*



*Вуліца размешчана ў мікрараёнах Аркадзя і Гершоны, даўжыня - 2380 м.*



*Вуліца Нямцэвіча* размешчана ў мікрараёне Вычулкі, даўжыня - 1580 м. На вуліцы размешчана 42 дома. Знаходзіцца недалёка ад вуліцы Філатава і вуліцы Напалеона Орды.
*Вуліца Філатава* мае працягласць 975 м. *Вуліца Напалеона* Орды 1985 м. Пакуль што там пабудавана ўсяго 9 дамоў.Гэта прыватны сектар, дзе будуюцца сучасныя ўладкаваныя катэджы.

Вуліца *Якуба Коласа*



Вуліца размяшчаецца ў мікрараёне Кіеўка, даўжыня – 910м. Забудавана прыватнымі дамамі, пераважна аднапавярховымі. Пастаянна вядзецца работа па ўладкаванню як гэтых дамоў,так і гаспадарскіх надворкаў, надворных пабудоў.

Глава2

**Постаці пісьменнікаў, у гонар якіх названы вуліцы Маскоўскага раёна г.Брэта**

*Юльян Урсын Нямцэвіч (1757-1841г.)*



Нарадзіўся 16 лютага 1757 года ў шляхецкім родзе Нямцэвічаў ў вёсцы Скокі Берасцейскага павета. Ён быў старэйшым сынам з шаснаццаці дзяцей Мацея Нямцэвіча. Дзяцінства правёў у доме свайго дзеда. Навучаўся ў Брэсцкім езуіцкім калегіуме, рыхтаваўся да паступлення ў кадэцкі корпус. У 1770-1777 гадах працягнуў навучанне ў Рыцарскай школе ў Варшаве. Падарожнічаў па Заходняй Еўропе. Юльян Нямцэвіч наведаў Францыю, Англію, Італію. Быў паслом на чатырохгадовым сойме (1788-1792), удзельнічаў у распрацоўцы Канстытуцыі 3 мая 1791 года быў у складзе Адукацыйнай камісіі. Пасля перамогі Таргавіцкай канфедэрацыі ў 1792 годзе эмігрыраваў у Саксонію, потым Аўстрыю, Італію. Падчас паўстання 1794 года служыў ад'ютантам і сакратаром Касцюшкі. Быў паранены і трапіў у палон, знаходзіўся ў зняволенні ў Петрапаўлаўскай крэпасці ў Пецярбургу. У 1796 годзе разам з Касцюшкам з'ехаў у ЗША. У 1807 г. прыехаў у Варшаўскае герцагства, займаў пасаду сакратара Сената, у 1815 годзе стаў сакратаром Царства Польскага. Здзейсніў некалькі падарожжаў па тэрыторыі

сучаснай Беларусі з мэтай пошуку і апісання нацыянальных помнікаў - у 1809, 1816 і 1819 гадах.
Падчас паўстання 1830 года ўвайшоў у склад Часовага ўраду. Пасля падаўлення паўстання эмігрыраваў у Парыж. У эміграцыі цалкам прысвяціў сябе літаратурнай дзейнасці. Прытрымліваўся эстэтыкі класіцызму. У адной з першых сваіх літаратурных прац - палітычнай камедыі «Вяртанне амбасадара» (1790), выказаўся за сацыяльныя рэформы ў Рэчы Паспалітай, вызваленні сялян ад прыгону. З'яўляецца аўтарам зборніка «Літоўскія Лісты» (1812), дзе маляваўпесні" (1816). У кнігах «Дзённікі маіх часоў» (1848), «Podróże historyczne po ziemiach Polskich między rokiem 1811 a 1828 odbyte» (1858) апісаў Брэст, Гродна, Навагрудак, жыццё беларускіх сялян.
Памёр 21 мая 1841 года ў Парыжы.

*Янка Купала (1882-1942)*



Сапраўднае імя - Іван Дамінікавіч Луцэвіч - беларускі паэт, драматург, публіцыст, грамадскі дзеяч, адзін з заснавальнікаў сучаснай беларускай літаратуры і беларускай літаратурнай мовы, класік беларускай літаратуры, народны паэт БССР (1925), акадэмік АН БССР (1928) і АН УССР (1929). Нарадзіўся 7 ліпеня 1882г ў фальварку Вязынка Вілейскага павета (цяпер Маладзечанскі раён Мінскай вобласці) Удзельнічаў у стварэнні Белдзяржуніверсітэта, АН БССР, Нацыянальнага тэатра. Аўтар зборнікаў вершаў "Жалейка" (1908), "Гусляр" (1910), "Шляхам жыцця" (1913) паэм "Адвечная песня" (1910), "Сон на кургане" (1912), Магіла льва (1913). Жыццё класіка беларускай літартуры трагічна абарвалася ў 1942г. у Маскве.
Урна з яго прахом ў 1962 годзе перавезена У Мінск, пахавана на Вайсковых могілках.



*Св. Афанасій Брэсцкі ( прыкладна 1595-97 - 1648)*

Св. Афанасій (Філіповіч) нарадзіўся ці ў самім Брэсце, ці ў яго ваколіцах прыкладна ў 1595-97 годзе. У маладыя гады атрымаў цудоунейшую адукацыю і, як чалавек адукаваны, прыняты

быў на службу да двара Літоўскага гетмана Льва Сапегі, дзе, па волі польскага караля Сігізмунда займаўся выхаванем мнімага сына Марыны Мнішак, шляхціча Лубы, якога езуіты хацелі бачыць на рускім прастоле. Прыдворнае жыццё, поўнае раскошы, абцяжарвала Афанасія, а цяжкае жыццё праваслаўнага народа, прыгнятаемага і ганімага за веру праваслаўную, выклікалі ў душы неадольнае жаданне стаць на абарону веры народа. Таму ў 1627 годзе Афанасій пакідае двор і прыймае манашаства ў Свята-Духавым манастыры ў Вільні. Потым ён выбірае больш абасобленыя і больш строгія манастыры Куцяліскі (каля Оршы) і Міжыгорскі (каля Кіева).

У 1632 годзе Афанасій узводзіцца ў сан іераманаха і прызначаецца намеснікам Дубойскага манастыра, што пад Пінскам. У 1636 годзе быў вымушаны пакінуць манастыр, бо яго па распараджэнню канцлера Радзівіла перадалі езуітам. Афанасій перайшоў у Купяціцкі манастыр (пад Пінскам) Тут ён атрымаў цяжкае паслушанне: сабраць ахвяраваныя сродкі на пабудову ў манастыры новага храма. Ва ўмовах ганенняў на праваслаўных гэтае даручэнне было вельмі адказным і скаладаным, і Афанасій накіроўваецца ў Маскву да цара Аляксея, якім быў ласкава прыняты.

Каб прыцягнуць увагу да бедаў і патрэб свайго народа, уручыў цару кнігу, дзе выклаў, як «жители русские вопиют, что дети их живут без крещения, взрослые без брачного благословения, больные умирают без исповеди и Св. Причастия, умершие похороняются ночью скрытно и то – в поле, огородах, погребах, что становится хуже жития в турецкой неволе...» Афанасій атрымаў неабходныя сродкі і вярнуўся дадому. У Брэсце яшчэ больш актыўна вядзе барацьбу супраць прыгнечання.

У 1643 годзе трымае прамову ў Варшаве на паседжанні сейма. Наступствы гэтай прамовы былі сумныя: яга забралі ў турму, адкуль ён уцякае, але быў схоплены зноў і кінуты ў роў, запоўнены брудам, дзе ледзь не загінуў. Яго пазбавілі ігуменства, сана і направілі на пацверджанне гэтай пастановы ў Кіеў на суд да мітрапаліта Пятра Магілы. Мітрапаліт, аднак, св. Афанасія вінаватым не лічыў і хутка направіў у Брэст на ігуменства.

У 1644 годзе у пошуках абароны ад злачынстваў лацінян накіроўваецца ў Кракаў. Прысутнасць яго ў Кракаве становіцца ракавым для яго. Тут, у Кракаве, св. Афанасій сустракаецца з пасламі Маскоўскага цара, Якія прыбылі туды, для высвятлення асобы самазванца, якога палякі выдавалі за сына ілжэДзмітрыя і Марыны Мнішак і прапаноўвалі яго кандыдатам на Маскоўскі прастол. Св. Афанасій адкрыў паслам, што самазванец, якога хаваюць у сябе езуіты, просты шляціч Луба, былы яго выхавнец, і , у якасці доказу, прад’явіў некалькі пісьмаў Лубы за яго подпісам «Ян Фавстін Дмітровіч».

За раскрыццё такой важнай таямніцы езуіты вырашылі пагубіць св. Афанасія чаго б гэта не каштавала. Па іх жаданню прэпадобны зноў быў змешчаны ў Варшаўскую турму, але і тут ён не пакідае сваёй справы. Св. Афанасій падае скаргі каралю Уладзіславу IV, суправаджаючы іх асаблівым мемарыялам (памятнаю запіскаю). Адна з гэтых скаргаў была прачытана не толькі каралём, але і сенатарамі, і з яе была зроблена вялікая колькасць спіскаў, так многа праўды яна ўтрымлівала і так моцна ўздзейнічала на сумленне людзей, яшчэ яго не страціўшых.

Аддаючы свой мемарыял на добразычлівасць караля, Афанасій гаворыць, што для яго не складана адрозніць падман ад ісціны, і тут жа папераджае, што, калі кароль не выступіць на абарону праваслаўных, то ворагі Праваслаўя самі сябе знішчаць. У мемарылле ён змясціў і скаладзены ім верш, дзе асмельваецца падвергнуць крытыцы непарадак у Рымскай іерархіі. Пасля гэтых скаргаў св. Афанасія вызвалілі ад кандалоў, але не выпускалі з астрога, пакуль не быў атрыманы ліст ад караля Уладзіслава на вольны выезд яго з Варшавы.



Паміж іншым, гэты ліст св. Афанасію нічым не дапамог, у такой ступені усемагутнай была ўлада езуітаў у Польшчы. Ён пераводзіцца ў Кракаўскую турму, дзе падвяргаецца знявазе, пабоям і голаду. Там бы ён і загінуў бы, калі б не быў вызвалены па патрабаванню Маскоўскіх паслоў. Аднак і гэта вызваленне было дапушчана езуітамі пры ўмове адпраўкі яго ў Кіеў да мітрапаліта Пятра Магілы і пазбаўлення яго магчымасцей падтрымліваць зносіны са светам. Тут, у Кіеве, ён напісаў свой «Дыярыўш», у якім апісаў сваё шматпакутнае жыццё ў барацьбе з езуітамі. Больш за год прабыў у Кіеве св. Афанасій, а па смерці мітрапаліта Пятра Магілы зноў вярнуўся ў Брэст, дзе быў адноўлены на пасадзе ігумена Сімеонаўскага манастыра. Але набліжаўся ракавы момант. Хоць у час паўстання Багдана Хмяльніцкага св. Афанасій знаходзіўся ў сваім манастыры, яго ўсё роўна схапілі і абвінавацілі ў падтрымцы паўстанцаў (пасылаў ім прамовы і порах). Абвінавачванне засталося недаказаным. Аднак лёс св. Афанасія быў ужо вырашаны. 1 ліпеня 1648 года ён быў змешчаны ў падзямелле Брэсцкага ваеннага замка, а пад раніцу 5-га верасня св. Афанасій быў употайкі выведзены ў лес, размешчаны ў 2-х вярстах па Кіеўскай дарозе між Брэстам і паселішчам Гершонавічы, і там замучаны.

Спрабуючы прымусіць адмовіцца ад праваслаўя і прызнання ўніі, яго спачатку прыпальвалі агнём, а потым загадалі рыць сабе магілу. Калі яму ў апошні раз прапанавалі адмовіцца ад сваіх слоў, ён бясстрашна сказаў: «Што я сказаў, тое пацверджваю, з гэтым і памру». Тады гайдук прыставіў мушкет да галавы прэпадобнамучаніка, папярэдне папрасіўшы ў яго прабачэння і блаславлення на гэтую пазорную справу. Хоць лоб св. Афанасія быў прабіты дзвюма кулямі, ён яшчэ прастаяў некаторы час, абапіраючыся на сасну. Паўжывога яго скінулі ў магілу, там ён перавярнуўся на спіну, склаў рукі крыжападобна на грудзях і заціх.

Памяць святога прэпадобнага Афанасія Брэсцкага святкуецца 2 жніўня - 18 верасня (новы стыль )

*Францыск Скарына (меркавана 1490 - 1551 гг.)*



Беларускі і ўсходне-славянскі першадрукар, вучоны, мысліцель, гуманіст, перакладчык і пісьменнік эпохі Адраджэння. Нарадзіўся ў Полацку ў сям'і купца. Першапачатковую адукацыю атрымаў у Полацку і, магчыма, у Вільні. У 1504 годзе паступіў у Ягелонскі універсітэт у Кракаве, дзе ў 1506-м атрымаў ступень бакалаўра філасофіі. У 1507 -1511 гг. падарожнічаў, працаваў і вучыўся ў гарадах Заходняй Еўропы, быў сакратаром дацкага караля. У 1512 г. абараніў у Падуанскім універсітэце вучоную ступень доктара "лекарскіх навук" (медыцынскіх), меў таксама ступень доктара вольных (філасофскіх) навук. Пры падтрымцы віленскіх гараджан Якуба Бабіча і Багдана Онкава утварыў у Празе першае ў гісторыі беларускае выдавецтва, дзе ў 1517-1519 гг. выпусціў 23 кнігі Бібліі пад агульнай назвай «Біблія Руска», выкладзеная доктарам Францыска Скарыны з хвалебнага горада Полацка, Богу ка чці і народу паспалітым да добрага навучаньне »(на старабеларускай мове). Вярнуўшыся каля 1520-га года ў Вільні, абсталяваў у доме Я. Бабіча друкарню, тут надрукаваў на царкоўна-славянскай мове «Малую падарожную кніжыцу» (1522) і «Апостал» (1525 г.).

Улічваючы выдатныя дасягненні Ф. Скарыны ў развіцці кнігадрукавання, у розных галинах ведаў, яму аддаюцца ўшанаванні ў многіх краінах. Лондан і Кракаў, Познань і Прага, Вільня і Варшава - у кожным з гэтых і іншых гарадоў ёсць універсітэт або помнік, музей або памятная дошка, на якіх напісана імя нашага вялікага земляка. Ён валодаў многімі еўрапейскімі мовамі, але роднае слова ставіў вышэй за ўсё. У "Зале сарака" Падуанскага Універсітэта намаляваны фрэскавыя партрэты сарака найвялікшых выпускнікоў гэтага універсітэта. Сярод іх другі пасля Галілея Галілеа - Францыск Скарына. У нашай рэспубліцы помнікі Ф. Скарыну маюцца ў Полацку і Мінску, заснаваны ордэн і медаль яго імя. Імем слаўнага суайчынніка названы вуліцы многіх населеных пунктаў, у тым ліку і набярэжная ў Брэсце.

*Мікола Засім (1908 – 1957г.)*



Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Працаваў па найму на Пружанскім лесапільным заводзе. У 1924 уступіў у падпольную камсамольскую арганізацыю. За ўдзел у рэвалюцыйным руху польскія ўлады яго не раз арыштоўвалі, за гэта ў 1925 быў заключаны ў Пружанскую турму. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР (1939) абраны старшынёй Шанеўскага сельсавета. У час Вялікай Айчыннай вайны - партызан, інструктар Брэсцкага абласнога антыфашысцкага камітэта. У 1944-1946 - загадчык аддзела Пружанскага райвыканкама. Член Саюза пісьменнікаў СССР (з 1945). Пасля заканчэння Рэспубліканскай партыйнай школы пры ЦК КПБ (1947) працаваў у брэсцкай абласной газеце «Заря» (1948-1957), затым - у раённай газеце «Заря над Бугам". Кіраваў абласным літаб'яднання.

Дэбютаваў вершамі ў 1928. Друкаваўся ў часопісах «Маланка», «Літаратурная старонка»; у газетах «Наша воля», «Наша праца"; у Айчынную вайну - у падпольных газетах «Заря», «За Радзіму»). Аўтар зборнікаў паэзіі «Ад усяго сэрца» (1947), «Вершы» (1954), «Выбранае» (1960), «Вершы» (1973), «А за намі Белавежа» (вершы і паэма, 1984).

Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі

*Якуб Колас (1882-1956)*

Прафесійны шлях класіка пачаўся ў вёсцы Люсіна Ганцавіцкага раёна і Пінкавічы Пінскага раёна. Пра гэты час Якуб Колас пісаў у аўтабіяграфіі, што



менавіта тут, на Палессі, ён упершыню захапіўся нелегальнай літаратурай. Гэтыя брашуркі скіравалі ход яго думак зусім у іншым кірунку. Газеты радыкальнага характару, японская вайна, гутаркі з настаўнікамі накіравалі пісьменніка на рэвалюцыйны шлях. За ўдзел у нелегальным настаўніцкім з'ездзе Канстанцін Міцкевіч быў асуджаны на тры гады турмы. Пасля выхаду на волю знайсці працу па спецыяльнасці былому " палітычнаму " было нерэальна. Выручыў былы аднакурснік Вікенцій Філіповіч, які служыў у Лунінецкім народным вучылішчы і даваў прыватныя ўрокі. Частку гэтых заняткаў ён па-брацку падзяліў з беспрацоўным таварышам, які ў лістападзе 1911 года прыехаў у Лунінец. Хоць бытавых перашкод хапала, але не яны вырашалі лёс будучага класіка. Воля ўздзейнічала як магутны стымулятар творчасці і вынікам з'явілася чароўная паэма " Сымон-музыка". У 2018г. гэтаму геніяльнаму твору спаўняецца 100 год.

У 1912 годзе былы палітычны вязень атрымаў пасведчанне " о благонадёжности" і працягнуў афіцыйную выкладчыцкую дзейнасць. Спачатку быў накіраваны ў школу вёскі Купяцічы, а адтуль перайшоў на працу ў трэцяе гарадское вучылішча Пінска. Канстанцін Міхайлавіч жыў тут на ціхай Вадаправоднай вуліцы ў доме фельдшара чыгуначнай станцыі. Некалькі пакояў у доміку звычайна здавалася. Суседкай Канстанціна Міцкевіча аказалася маладзенькая настаўніца, якая выкладала ў чыгуначнай школе. Так адбылося знаёмства паэта з Марыяй Дзмітрыеўнай Канеўскай – будучай жонкай.

Пазней Якуб Колас расказваў: " Добра было б пагартаць усё тое, што я пісаў у той час ёй і пра яе. Я саромеўся тых вершаў... У друк, канечне, нічога не аддаваў, нязручна займаць месца ў газеце і час у людзей на сваё, тое, што толькі мне належала. Я здзіўляўся і не разумеў, як гэта можна адважыцца друкаваць вершы пра каханне? Калі ты яго прыдумваеш, то не варта публікаваць няпраўду. А калі пішаш пра тое, што ёсць ці было, як тады, выставіўшы на паказ усё, вядомае аднаму табе і твайму дарагому чалавеку глядзець яму ў вочы? Табе даверана таямніца, ты быццам з кімсьці ў змове і раптам раскідаўся патаемным, ды яшчэ і падпісаўся."

Для мяне важна было даведацца пра адносіны да кахання і якім было каханне самога Якуба Коласа. Таму што і мне не заўсёды проста разабрацца, калі ўзнікае каханне, а калі толькі пустазвонства і летуценнае захапленне. Цяжкавата верыць тым, хто слова “ каханне” скланяе на ўсе лады.

Вяселле адбылося ў чэрвені 1913 года. У канцы ліпненя 1917 года будучы класік беларускай літаратуры, а на цяперашні момант падпаручык царскай арміі Канстанцін Міцкевіч на пасадзе начальніка эшалона накіроўваецца на Румынскі фронт. Так Якуб Колас пакідае Брэстчыну, з якой звязаны лёсавызначальныя падзеі жыцця і творчасці вялікага паэта і празаіка, класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа.

*Іван Паўлавіч Мележ (1921 – 1976 г.*



Іван Паўлавіч Мележ нарадзіўся ў в. Глінішча, Хойніцкага раёна, Гомельскай вобласці — беларускі празаік, драматург, публіцыст. Народны пісьменнік Беларусі (1972). Лаўрэат Ленінскай прэміі (1972, за раман «Людзі на балоце» і «Подых навальніцы»), Дзяржаўнай прэміі імя Якуба Коласа (1976, за зборнік «Жыццёвыя клопаты»), Літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа (1962, за раман «Людзі на балоце»).

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і: бацька — Павел Фёдаравіч, маці — Марыя Дзянісаўна. Скончыў сямігодку ў Алексічах, дзесяцігодку (СШ № 1) у Хойніках (1938), працаваў у Хойніцкім райкаме камсамола.

У 1939 паступіў у Маскоўскі інстытут гісторыі, філасофіі і літаратуры і з 1-га курса быў прызваны ў Чырвоную Армію.

Летам 1940 удзельнічаў у далучэнні Паўночнай Букавіны да СССР. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны на фронце — на Збручы, пад Уманню, Нікалаевам, Сінелькавам, Растовам-на-Доне, Лазавой.

У чэрвені 1942 пад Растовам цяжка паранены і пасля лячэння ў тбіліскім шпіталі адпраўлены ў тыл. Жыў у Бугуруслане, потым выкладаў ваенную падрыхтоўку ў Малдаўскім педагагічным інстытуце, а з 1943 — у БДУ, які знаходзіўся тады на станцыі Сходня ў Падмаскоўі, дзе вучыўся спачатку завочна на філалагічным факультэце, а затым перайшоў на стацыянар (скончыў у 1945 ужо ў Мінску). Пасля вучыўся ў аспірантуры, выкладаў беларускую літаратуру ва ўніверсітэце, працаваў у рэдакцыі часопіса «Полымя», у апараце ЦК КПБ. Член

Саюза пісьменнікаў СССР з 1945, з 1966 — сакратар, а ў 1971—1974 — намеснік старшыні праўлення СП БССР.

Іван Мележ быў старшынёй праўлення Беларускага аддзялення таварыства «СССР — Францыя», старшынёй Беларускага камітэта абароны Міру, членам Сусветнага Савета Міру.

Узнагароджаны двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнамі Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны» і медалямі. Народны пісьменнік БССР (1972). Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа (1962) за раман «Людзі на балоце», Ленінскай прэміі (1972) за раманы «Людзі на балоце» і «Подых навальніцы», Дзяржаўнай прэміі БССР (1976) за кнігу крытычных нарысаў, артыкулаў «Жыццёвыя клопаты» (пасмяротна).

Дэбютаваў у 1939 вершамі. Першае выступленне ў друку як празаіка адносіцца да 1943 (газета «Бугурусланская правда»). Першае апавяданне на беларускай мове «Сустрэча ў шпіталі» (1944). Адно з ранніх апавяданняў — «У завіруху» — высока ацаніў Кузьма Чорны. У 1946 яно дало назву зборніку. Аповесць «Гарачы жнівень» (1946) пра цяжкасці аднаўленчага перыяду. Выдаў зборнікі аповесцей і апавяданняў «Гарачы жнівень» (1948), «Заўсёды наперадзе» (нарыс, 1948), «Блізкае і далёкае» (1954), «У гарах дажджы» (1957), «Што ён за чалавек» (апавяданні, аповесці, нарысы, 1961).

Першы раман «Мінскі напрамак» (1952). У 1960—70-я г. гэты твор перапрацаваны і стаў больш шматпланавым і маштабным па ахопе падзей, багатым на сапраўдныя народныя характары, праз якія паказана героіка і трагедыя вайны.

Іван Мележ — аўтар цыкла раманаў «Палеская хроніка»: «Людзі на балоце» (1962), «Подых навальніцы» (1966) і «Завеі, снежань» (1976). Раман «Людзі на балоце» ён пачаў як твор лірычны і называў яго «лірычным раманам», а наступныя раманы трылогіі ствараў ужо як трагедыйныя раманы-даследаванні. У іх выявілася грамадзянская смеласць і ідэйна-мастацкая маштабнасць у асэнсаванні складаных абставін калектывізацыі на Палессі, жыцця Беларусі 1920—30-х г., праўдзівасць і шчырасць аўтара ў спалучэнні з яго высокай прафесійнай культурай, глыбокім і тонкім псіхалагізмам, разуменнем душы беларускага селяніна. Непаўторная мастацкая канцэпцыя тагачаснага жыцця народа, вялікі ідэйны змест данесены праз дасканалую мастацкую форму і адметныя вобразы. «Палеская хроніка» — глыбокае філасофска-мастацкае асэнсаванне жыцця беларускага народа на вельмі важным гістарычным этапе, яна стала нацыянальнай эпапеяй.

Імем Івана Мележа названы школа ў в. Глінішча, бібліятэка ў Гомелі, цеплаход, Мазырскі драматычны тэатр. У в. Глінішча адкрыты літаратурны музей. У 1980 устаноўлена Літаратурная прэмія Саюза пісьменнікаў Беларусі імя

Івана Мележа. Яго імя носіць вуліца ў Мінску, у Брэсце, вуліцы ў іншых гарадах Беларусі.

*Калеснік Уладзімір Андрэевіч (1922-1994 г.)*




Калесніка Уладзіміра Андрэевіча ўсе пісьменнікі і паэты старэйшага і сярэдняга пакаленняў Брэстчыны лічаць сваім духоўным настаўнікам. Ён нарадзіўся ў вёсцы Сіняўская Слабада (цяпер Карэліцкі раён Гродзенскай вобласці). У гады Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у стварэнні падпольных камсамольскіх груп, у партызанскім руху, за што пасля быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1ступені. Скончыў Мінскі педагагічны інстытут, затым аспірантру. Працаваў у Бабруйскім настаўніцкім інстытуце, а ў 1956-1988 гадах загадчыкам кафедры беларускай літаратуры Брэсцкага педагагічнага інстытута (цяпер Брэсцкі дзяржаўны Універсітэт ім. АС. Пушкіна) Кандыдат філалагічных навук, прафесар. У 1979 г. атрымаў званне "Заслужаны работнік Вышэйшай школы беларускай ССР". Навуковая дзейнасць Уладзіміра Андрэевіча была адзначана Дзяржаўнай прэміяй БССР імя. Якуба Коласа (1980 г. г.) У.А. Калеснік быў ініцыятарам стварэння Брэсцкага літаратурнага аб'яднання і ўзначальваў яго ў 1956-1970 гадах. Менавіта ў гэты час з-пад яго "крыла" з'явіліся шматлікія беларускія літаратары. У 1960 г быў прыняты ў Саюз пісьменнікаў СССР. Велізарную вядомасць яму, як пісьменніку, прынесла сумесная з Алесем Адамовічам і Янкам Брылём творчая праца над кнігай "Я з вогненнай Вескі ....". У гонар Уладзіміра Калесніка адкрыта мемарыяльная дошка на доме, у якім ён жыў. Саюз пісьменнікаў Беларусі заснаваў прэмію яго імя, у БрДУ імя. А. С. Пушкіна ўстаноўлена спецыяльная стыпендыя У.А. Калесніка.



*Міцкевіч Адам ( 1798 – 1885г.)*

Міцкевіч Адам класік літаратуры беларускага паходжання, грамадскі дзеяч, публіцыст.

Дзіцячыя і юнацкія гады прайшлі ў Навагрудку.Праз два гады пасля яго нараджэння сям’я перабралася ў Навагрудак, дзе скончыў павятовую дамініканскую школу. У 1815 г. паступіў у

Віленскі ўніверсітэт. Разам з аднадумцамі А. Міцкевіч стварыў саюз філаматаў. Таварыства першапачаткова ставіла культурна-асветніцкія мэты, але пазней наладзіла сувязь з будучымі дзекабрыстамі.

Перыядам інтэнсіўнай літаратурнай вучобы сталі 1817-1819 гг. Пад уплывам беларускага фальклору і заснаваных на ім балад Я. Чачота А. Міцкевіч становіцца на шлях рамантызму. Немалаважную ролю ў гэтым адыграла каханне да Марылі Верашчакі. Так з’явіліся балады “Свіцязь”, “Свіцязянка”, “Рыбка” і інш., што ўвайшлі ў першы том твораў паэта “Балады і рамансы” (1822).Другі том твораў А. Міцкевіча выйшаў у 1823 г.,складаўся з дзвюх паэм — “Гражына” і “Дзяды”.

Пасля заканчэння ўніверсітэта А. Міцкевіч быў накіраваны настаўнікам у Коўна. У 1823 г. яго арыштавалі па справе філаматаў і філарэтаў і кінулі ў базыльянскі астрог. Праз паўгода Міцкевіча накіравалі настаўнікам у Адэскі ліцэй. Тут з’явіліся бліскучыя цыклы санетаў і былі зроблены першыя накіды паэмы “Конрад Валенрод”. У 1825 г. А. Міцкевіч вярнуўся з Адэсы ў Маскву, дзе выдаў трэцюю па ліку кнігу — “Санеты”.

У 1828 г. А. Міцкевіч пераехаў жыць у Санкт-Пецярбург, дзе выйшла ў свет яго паэма “Конрад Валенрод” і два тамы вершаў. У 1829 г. паэт назаўсёды пакінуў Расію. У 1832 г. паэт апынуўся ў Парыжы. Тут ён апублікаваў новую паэму “Пан Тадэвуш, альбо Апошні наезд у Літве”. У 1839 г. А. Міцкевіч стаў прафесарам лацінскай літаратуры Лазанскага ўніверсітэта ў Швейцарыі, а праз год перайшоў у Калеж дэ Франс у Парыжы, дзе на працягу 1840-1844 гг. чытаў курс лекцый па славянскіх літаратурах. У сярэдзіне 30-х гадоў Міцкевіч захапіўся гісторыяй. Ён працаваў над першым томам гісторыі Польшчы, але рукапіс кнігі не захаваўся. У 1835-1836 гг.

З вялікім спадзяваннем сустрэў паэт рэвалюцыю 1848 г. у Заходняй Еўропе. У Рыме ствараў польскія легіёны для падтрымкі руху карбанарыяў. У Парыжы заснаваў інтэрнацыянальную газету “Трыбуна народаў”, у якой друкаваліся выступленні ў абарону прыгнечаных народаў. У 1855 г. накіраваўся ў Стамбул. Турцыя ў той час ваявала з Расіяй, і А. Міцкевіч збіраўся арганізаваць там польскія легіёны. Свой намер ён не паспеў здзейсніць, бо памёр ва ўзросце 57 гадоў у Канстанцінопалі, дзе і быў пахаваны. Пры першай магчымасці астанкі паэта перавезлі ў Парыж, а ў 1890 г. — у Кракаў і захавалі ў асобнай нішы Вавельскага замка.



*Філатаў Аляксей (Леанід) Георгіевіч*

Нарадзіўся Аляксей (Леанід) Георгіевіч Філатаў 13 мая 1939 года ў вёсцы Бабінічы Віцебскага раёна.

Пасля вераснёўскіх падзей 1939 года сям'я Філатавых прыехала працаваць на Брэстчыну. Маці, Фядора Восіпаўна, пасля заканчэння Віцебскага педагагічнага інстытута працавала ў Брэсцкім педвучылішчы. Бацька, Георгій Фёдаравіч, атрымліваў вышэйшую адукацыю ў Маскве, адкуль і трапіў на фронт. Сям'я жыла ў Маларыце, у цёткі Марыі Восіпаўны, якая працавала завучам Маларыцкай СШ № 1.
У першы ж дзень вайны Лёня асірацеў: маці загінула ад першага нямецкага снарада, які разарваўся ў Маларыце. Маленькі Леанід, паранены ў галаву, пакалечаныя дзеці, бабуля з выбітымі асколкамі вачыма трапілі ў мясцовы шпіталь, які ў хуткім часе захапілі немцы. "Трымаліся толькі тым, чаго не шкадавалі нам шчырыя маларыцкія людзі, кладучы яйкі, бутэльку малака, бохан хлеба, кусок сала мне ў рукі", – з удзячнасцю ўспамінаў пісьменнік дабрыню і спагадлівасць маларытчан у аўтабіяграфіі "Зуб мудрасці". Усынавіў хлопца Аляксей Нічыпаравіч Афанасьеў, дырэктар Ляхавецкай школы. Многае прыйшлося перажыць хлопцу ў дзяцінстве, у тым ліку фашысцкі канцлагер.
Найлепшыя чалавечыя якасці ў Леаніда Філатава былі выхаваны ў сям'і, якую ён заўсёды ўспамінае з пяшчотай: "У верасні года Перамогі пайшоў шасцігадовым у школу за прыёмным бацькам – настаўнікам Аляксеем Нічыпаравічам Афанасьевым, каторага і па сей дзень добрым словам успамінае ўсё наша вялікае лясное сяло Ляхаўцы. Калі адплыло ў Прырыцкім краі галоднае, ды ўсё ж залатое дзяцінства, пайшла цяжкая жыццёвая проза. Не стала бацькі – разумнага, найвышэйшай культуры чалавека, памерла маці, Ларыса Мефодзіеўна – бясконцай дабрыні жанчына, што аддала ўсе свае сілы, каб вывесці мяне ў людзі".
Леанід Філатаў закончыў Брэсцкі чыгуначны тэхнікум. Вучыўся завочна на філалагічным факультэце Брэсцкага педагагічнага інстытута, які закончыў у 1971 годзе. У інстытуце завязалася шчырае сяброўства з Уладзімірам Калеснікам і Аляксеем Майсейчыкам, першы з якіх стаў літаратурным настаўнікам, а другі – сябрам. Працаваў Леанід Георгіевіч галоўным інжынерам у дарожным будаўніцтве, майстрам на чыгунцы, журналістам у маларыцкай і брэсцкай "раёнках" і настаўнікам, трэнерам, дырэктарам Брэсцкай спартыўнай школы № 4 – гэта дало багаты жыццёвы вопыт і матэрыял для многіх твораў.
З цеплынёй і ўдзячнасцю пісьменнік успамінае літаратурныя "чацвяргі" – пасяджэнні літаратурнага аб'яднання ў Брэсце, дзе вучыліся адзін у аднаго М. Засім, У. Стэльмашук, У. Калеснік, М. Рудкоўскі, М. Купрэеў, В. Жуковіч, І. Мельнічук, А. Гарай і іншыя: "Гэта быў пачатак пачатку. Нам было хораша разам. Маладыя паважалі старэйшых, іхні ратны подзвіг,

глядзелі на іх ва ўсе вочы, слухалі ва ўсе вушы. А было чаго паслухаць, на каго паглядзець. Што ні чалавек, то асоба, у кожнага так шмат перажытага і адчутага ў перапоўненай душы, што маўчаць ён ужо не можа”.
Першыя мастацкія творы Леаніда Георгіевіча былі надрукаваны на старонках маларыцкай раённай газеты “Сельскае жыццё” у 1958 годзе – апавяданне “Зышліся” і апрацаваныя народныя легенды “Рыта” і “Лукава”. У гонар бацькі Аляксея Нічыпаравіча пісьменнік узяў яго імя як літаратурны псеўданім. Аляксей Філатаў – аўтар 10-ці кніг прозы: “Ляхавецкая  торба” (1992), “Дарога” (1997), “Адарваць ад сэрца” (2000), “Жывая зямля” (2001), “Страла жыцця” (2007), “Жывому – жыць: (Споведзь качагара)” (2013) і інш. У сваіх творах, блізкіх да анекдотаў, пісьменнік натуральна выкарыстоўвае жывую гутарковую мову вяскоўцаў. Усе яго кнігі пра жыццё, у іх яно паўстае такім, якім было: пісьменнік яго не прыхарошвае, а піша толькі праўду. Ён выступае і як сведка апісаных падзей, і як іх удзельнік. Піша шчыра – дзе з гумарам, дзе з іроніяй, а дзе і самаіроніяй. Спагада, дабро і любоў – вось тры кіты, на якіх трымаецца яго чалавечы гуманізм.
Аляксей Філатаў вядзе актыўную літаратурную працу ў абласным аддзяленні Саюза беларускіх пісьменнікаў, у які быў прыняты ў 2002 годзе. Піша артыкулы аб творчасці пісьменнікаў Брэстчыны, перакладае з рускай і украінскай моў на беларускую.
Пісьменнік жыве ў пасёлку Мухавец Брэсцкага раёна, дзе працаваў настаўнікам да выхаду на пенсію, але душа яго належыць Прырыцкаму краю. Аўтабіяграфічны верш “Іскрыстыя жарынкі” Леаніда Філатава выяўляе духоўную сувязь з маларыцкай зямлёй чалавека, які абавязаны маленькай радзіме і жыццём, і выхаваннем, і станаўленнем таленту творцы.
Узнагароджаны літаратурнымі прэміямі: “Берасцейская зорка–2000”, “Мядовая” (2007), дыпломам імя У. А. Калесніка (2007).

Заканчэнне

У даследчай рабоце “ Імёны беларускіх пісьіеннікаў у назвах вуліц Маскоўскага раёна г.Брэста ” мы пералічылі ўсе вуліцы Маскоўскоўскага раёна г.Брэста, сабралі інфармацыю пра вуліцы, названыя імёнамі славутых людзей і імёнамі беларускіх пісьменнікаў, вызначылі працэнтныя суадносіны назваў вуліц. У працэсе работы ў нас абудзілася цікавасць да гісторыі роднага горада, жаццёвага і творчага шляху класікаў беларускай літаратуры. Работа дазволіла развіць нашы здольнасці ў галіне пошуку, адбору і сістэматызацыі матэрыялу. Мы засвоілі некатрыя новыя для сябе прыёмы работы ІКТ. Удасканалілі навыкі стварэння інтэрв’ю, відэаанкетавання.

Новым з’яўляюцца табліцы, распрацаваныя намі ў дадатках, яны з’яўляюцца арыгінальнымі і выкарыстоўваюцца ўпершыню.

Мы лічым, удалося рашыць пастаўленыя задачы

даць уяўленне аб славутых земляках-сучасніках і продках, развіваць уменне асэнсоўваць, вызначаць адметнае, выхоўваць беражлівае стаўленне да спадчыны.

Спіс літаратуры


1. “ Беларускія пісьменнікі ”. Даведнік, Мінск,   “ Мастацкая літаратура ”, 1994.
2. “ Берасцейскія карані ” Гісторыка-краязнаўчы і літаратурны зборнік. Брэст, 1993.
3. “Брест. Московский район. Портрет на фоне времени”. Брест. Полиграфика. 2013.
4. “Брест”. Энциклопедический справочник. Минск. Издательство “ Белорусская Советская Энциклопедия” имени Петруся Бровки, 1987.
5. Житие и Акафист преподобного Афанасия, игумена Брестского.
6. Гніламёдаў У. Іван Мележ. Мн., 1984
7. Курков И. “ Брестчина”. Минск.“ Медиафакт”, 2005г
8. Ляшук В. Іван Мележ у школе. Мн., 1981;
9. “ Улицы Бреста рассказывают”. Под общ. Ред. П.Н. Тишука. Брест. ООО   “ РИА “ Вечерний брест””, 2016.
10. “Юлиан Урсын Немцевич: жизнь и творчество”. Библиографические материалы.  ОАО “ Брестская типография”, 2007.

*Змест*

1. Уводзіны …………………………………………………………………………… 1
2. Глава 1Суаднясенне імёнаў беларускіх пісьменнікаў  і назваў вуліц Макоўскага рёна  …………………………………………………..2
3. Глава 2.  Характарыстыка вуліц ……………………………………….4
4. Глава 3. Постаці пісьменнікаў, у гонар якіх названы  вуліцы Маскоўскага раёна г.Брэта ……………............................... ..10
5. Заканчэнне ……………………………………………………………………..23
6. Спіс літаратуры …………………………………………………………….24
7. Дадаткі ……………………………………………………………………………